# ЕЎРАІНТЭГРАЦЫЯ: ПАШЫРЭННЕ ЕУ НА ЎСХОД

*С. С. Валасюк*
*ЭФ, Брэсцкі політэхнічны інстытут,*
*г. Брэст, Беларусь*

За апошнія 4 дзесяцігоддзі ідэя Еўрапейскай інтэграцыі, прайшла доўгі шлях. Увасобленая напачатку ў форму ЕАВС, воргана па каардынацыі кантынентальнай вытворчасці і гандлю прамысловай сыравінай, яна, імкліва пашыраючыся на ўсё большую колькасць напрамкаў палітычнай, сацыяльна-эканамічнай і культурнай дзейнасці чалавека, на пачатку 90-х гадоў выйшла на новую, якасна вышэйшую ступень. Над Еўропаю ўстаў золак Маастрыхту.

Заканчэнне халоднай вайны не толькі прынесла Еўропе доўгачаканую палёгку, але і спарадзіла роўна новыя магчымасці і праблемы, сярод якіх пытанне пашырэння еўрапейскіх структур за кошт прыняцця ў склад Еўрапейскай Уніі (ЕУ) краін Цэнтральнай Еўропы (КЦЕ) мае стаць "падзеяй №1" бліжэйшага дзесяцігоддзя.

На працягу сваёй гісторыі ЕУ зазнала чатыры пашырэнні і павялічыла свой склад з 6 - ці да 15 - ці ўдзельнікаў.

У адрозненне ад папярэдніх павелічэнняў еўраструктур, цяперашні працэс носіць не толькі адзнаку вялікай важнасці, але і мае канцэптуальны змест, абумоўлены шэрагам унікальных варункаў:

- ЕУ, які ўшчыльную падышоў да стварэння ўласнай валюты, характарызуецца большай ступенню інтэграванасці, чым колішняя ЕЭС і ўзровень патрабаванняў да прэтэндэнтаў цяпер якасна вышэйшы, чым у часы ранейшых пашырэнняў.
- 10 краін-прэтэндэнтаў маюць памеры і насельніцтва сумяшчальныя з аналагічнымі паказчыкамі ЕУ.
- Краіны-прэтэндэнты знаходзяцца на розных ступенях сацыяльна-эканамічнай трансфармацыі.
- Паспешлівыя рашэнні могуць справакаваць палітычныя складанасці як у КЦЕ, гэтак і ўнутры самой ЕУ, нестабільнасць на кантынэнце і спарадзіць хвалю еўрапесімізму.

Каб атрымаць допуск да ўдзелу ў працэсе пашырэння ЕУ, КЦЕ мусяць адпавядаць шэрагу падставовых патрабаванняў у наступных сферах.

*У палітычным плане* можна канстатаваць. што большасць КЦЕ знаходзіцца на слушным шляху. Выключэнні — Славаччына і Латвія — крытыкуюцца за парушэнне шэрагу дэмакратычных прынцыпаў.

*Рынкавы крытэрый*, хаця і прызнаны збольшага выкананым. усё ж вымагае ўдасканалення. У большасці КЦЕ захавалася неапраўдана вялікая доля дзяржаўнага сэктару: Чэхія — 25%, Вугоршчына — 30%, Польшча — 36% ВУП, у той час, як, напрыклад у Чэхіі яшчэ не завершаны працэс рэструктурызацыі, што абумоўлена ажыццяўленнем ваўчарнай прыватызацыі. З іншага боку — відаць недаразвітасць інстытуцыяў нярынкавай прыроды, характэрных для еўрапейскай сацыяльнай мадэлі рынкавай эканомікі — сацыяльнага партнэрства, сацыяльных гарантыяў з боку дзяржавы, эфектыўнага збору падаткаў, рэформы аховы здароўя. Таму, каб канчаткова адпавядаць гэтаму крытэрыю, КЦЕ мусяць працягваць працэс інстытуцыянальнай трансфармацыі з шырэйшым прыцягненнем да кансультацыяў партыяў, грамадскіх рухаў і прафсаюзаў.

*Крытэрый канкурэнтаздольнасці* існуе на ўзроўні паасобных вытворцаў ды галінаў і на ўзроўні нацыянальных эканомік. Ён ёсць узаемнаважным — для КЦЕ — каб пазбегнуць сумнага вопыту колішняй ГДР, для ЕУ — каб не атрымаць нахлебніка такіх жа маштабаў як яна сама. У адрозненне ад папярэдніх аналагаў, эвентуальны прыём у ЕУ у 2003 годзе ўсіх 10 прэтэндэнтаў павялічыць насельніцтва ЕУ на 28,3%, а агульны ВУП — толькі на 4,1%; нават абмежаванне прыёмам у 2003 годзе толькі 4 КЦЕ Вышаградскай групы дасць адпаведна прырост насельніцтва на 16,4%, а ВУП — на 3,1% (для прыкладу: пашырэнне ЕУ 1995 году дало +6,2% па абодвух паказчыках). Не нашмат лепей выглядае аналіз душавых паказчыкаў. Найнізшы ў ЕУ паказчык ВУП на чалавека (Грэцыя) складае 56% найвышшага (Аўстрыя), у той час як Славенія мае 48%, Чэхія — 44%, Вугоршчына — 31%, Польшча — 24%, Латвія — 16%. Тэмпы роста душавога ВВП, якія, што праўда, ў КЦЕ вышэйшыя, чым сярэднія па ЕУ, дазволяць, напрыклад, Польшчы "дагнаць" Грэцыю праз 17 - 20 год. У дадатак, галіновы аналіз гандлёвых балансаў паказвае, што па стане на к. 1995 — п.п. 1996 года КЦЕ з'яўляліся ў адносінах да ЕУ чыстым імпартэрам сельскагаспадарчай прадукцыі (-0,5 млрд. экю), прамысловай (-8,0 млрд. экю) ды ў агульным паказчыку (-8,5 млрд. экю). Пры гэтым, ў 1993 годзе доля экспарта ў ЕУ склала ў структуры КЦЕ 50% па прамысловым гандлі, у той час адпаведны паказчык ЕУ — толькі 5,1%. Зрэшты, пры

асобным разглядзе Чэхія, Вугоршчына, Польшча і Славаччына маюць станоўчы гандлёвы баланс з краінамі ЕУ. Ільвіная доля лішку прыпадае на ФРГ (+1,2 млрд. экю) без уліку турыстычных выдаткаў.

Выснова — большасць КЦЕ пакуль не адпавядае крытэрыю канкурэнтаздольнасці, хоць пэўных поспехаў у гэтым накірунку нельга не заўважыць.

Як вынік — *крытэрый волі да еўраадказнасці* мае на дадзены момант, бадай, самы песімістычны стан, што абумоўлена як аб'ектыўнымі ўмовамі, гэтак і недаспеласцю часткі кіруючых эліт.

Хоць вышэй прыведзены аналіз мае пэўнае песімістычнае адценне, аўтар не адмаўляе магчымасці паспяховай рэалізацыі праекту пашырэння ЕУ ўжо ў першым дзесяцігоддзі XXI стагоддзя. Ідзецца толькі пра вузкасць пануючага падыходу “не здавальняеш — адыдзі”, які застаўся ў спадчыну ад папярэдніх вопытаў. Аўтар далучае свой голас у падтрымку новай візіі гэтай праблемы, якую мае шэраг еўрапейскіх вучоных, засяроджаных вакол Еўрафоруму за Дэмакратыю і Салідарнасць. Яно палягае ў недапушчальнасці адштурхнуць няўдалых прэтэндэнтаў ад працэсаў стварэння новай Еўропы. На дадзеным этапе ёсць мэтазгоднымі:

- шматраўндавы працэс пашырэння;
- партнэрская падтрымка прэтэндэнтаў з боку краін ЕУ;
- прадстаўленне патрабуючым магчымасці доўгага транзітнага перыяду для завяршэння інстытуцыйнай трансфармацыі і нарошчвання канкурэнтаздольнасці;
- спалучэнне патрабаванняў з канкрэтнымі прапановамі каапера-цыі;
- стварэнне адмысловага статуснага рэжыму для тых, хто ня меў пераканаўчых поспехаў у першых раўндах.

### Літаратура

1. Eatwell J. et al (1997) *Not “Just Another Accession”. The Political Economy of EU Enlargement to the East,* IPRP, London.

2. Eurostat (1996a) “EU trade with CEECs”, *Statistics In Focus: External Trade*, no.7 Eurostat, Luxembourg.

3. Eurostat (1996b) “Purchasing power parities for central and eastern Europe: a comparison in real terms of GPD for 39 countries”, *Statistics In Focus: Economy and Finance*, no.4 Eurostat, Luxembourg.